# Рэспубліканская комплексная праграма аховы навакольнага асяроддзя (праграма «Экалогія») на 1991–1995 гг.: кароткая характарыстыка

*Завацкі Я. І., асп. ІІІ к. БДУ,*
*нав. кір. Паддубская А. Ф., канд. гіст. навук, дац.*

Высокія тэмпы эканамічнага развіцця БССР у пасляваенныя дзесяцігоддзі, ігнараванне пабочных наступстваў гаспадарчай дзейнасці, вузкаведамасны і нярэдка спажывецкі падыход да прыродных багаццяў, не заўсёды абгрунтаванае правядзенне меліярацыйных работ прывялі напрыканцы існавання СССР да высокай ступені антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе, а ў некаторых рэгіёнах рэспублікі і да сур’ёзнага пагаршэння экалагічнай абстаноўкі [1, с. 1]. Згодна з ацэнкай Інстытута глабальнага клімату і экалогіі Дзяржгідрамета СССР і АН СССР за 1991 г., па сукупнасці антрапагенных уздзеянняў Беларускі эканамічны раён займаў дзясятае месца сярод дваццаці эканамічных раёнаў Савецкага Саюза [2, с. 10].

З мэтай пераадолення адзначаных вышэй праблем у сакавіку 1989 г. ЦК КПБ і Саветам Міністраў БССР было разгледжана пытанне «Аб захадах па паляпшэнні экалагічнай абстаноўкі ў рэспубліцы». Прынятай на пасяджэнні пастановай партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва рэспублікі ў асноўным ухваліла распрацаваны Дзяржпланам БССР, Дзяржкампрыроды БССР, Акадэміяй навук БССР, Міністэрствам аховы здароўя БССР і Белгідраметам праект асноўных накірункаў аздараўлення і аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў Беларускай ССР на 1991–1995 гг. і на перспектыву да 2000 г.

Акрамя гэтага, для паляпшэння практычнага вырашэння праблем аховы прыроды і прыродакарыстання была сфармавана камісія ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР па пытаннях экалогіі на чале з кіраўніком беларускага ўрада М. Кавалёвым. Камісіі даручалася арганізаваць у 1989 г. распрацоўку рэспубліканскай комплекснай праграмы аховы навакольнага асяроддзя на 1991–1995 гг. і на перспектыву да 2000 г. і ўнесці яе ў надведамасныя органы рэспублікі. Таксама аб’яўлялася неабходным распрацаваць адпаведныя абласныя, гарадскія, галіновыя праграмы і праграмы «Экалогія» на кожным прадпрыемстве і арганізацыі [3, с. 1].

Змест асноўных накірункаў уключаў у сябе шэсць раздзелаў. Варта засярodзіць увагу на разглядзе асобных палажэнняў гэтага дакумента. Раздзел «Агульнасістэмныя захады» прадугледжваў распрацоўку ў 1989–1990 гг. і практычнае прымяненне ў рэспубліцы на працягу 13-й пяцігодкі эканамічнага механізму прыродакарыстання і доўгатэрміновых эканамічных нарматываў платы за прыродныя рэсурсы і шкодныя выкіды ў навакольнае асяроддзе. Да таго ж у 1989 г. планавалася распрацаваць рэспубліканскую

сістэму экалагічнага ўсеагульнага навучання насельніцтва, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў. Паводле раздзелу «У вобласці радыеэкалогіі», Савету Міністраў БССР, міністэрствам і ведамствам БССР, Гомельскаму і Магілёўскаму аблвыканкамам даручалася на працягу трох месяцаў распрацаваць рэспубліканскую комплексную праграму на 1990–1995 гг. па ліквідацыі на тэрыторыі рэспублікі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Напрыканцы асноўных накірункаў аб'яўлялася, што вырашэнне прыродаахоўных праблем з'яўляецца важнейшай сацыяльна-эканамічнай задачай. У гэтых адносінах вялікае значэнне надавалася таму, каб экалагічнае выхаванне непарыўна дапаўняла агульнаадукацыйную і прафесійную падрыхтоўку [1, с. 1, 3].

Распрацаваная на падставе асноўных накірункаў Рэспубліканская комплексная праграма аховы навакольнага асяроддзя (праграма «Экалогія») на 1991–1995 гг. і на перспектыву да 2000 г. абгрунтоўвала прыродаахоўную канцэпцыю, доўгатэрміновыя мэты і галоўныя шляхі іх вырашэння з улікам пераходу да рынкавай эканомікі. Разглядаемая праграма ставіла задачу замацаваць пры ажыццяўленні рацыянальнага прыродакарыстання эканамічныя метады кіравання, якія спалучаліся б з прававымі і выхаваўчымі захадамі. Аднак у сувязі з распадам СССР, што прывяло да нарастання сацыяльна-эканамічнага крызісу ў Беларусі і спыненні фінансавання шэрагу экалагічных мерапрыемстваў з агульнасаюзных фондаў, праграма не была выканана ў поўным аб'ёме [4, с. 167].

**Літаратура**

1. Основные направления оздоровления и охраны окружающей среды, рационального использования природных ресурсов Белорусской ССР на 1991–1995 гг. и на перспективу до 2000 г. // Советская Белоруссия. — 1989. — 28 марта. — С. 1, 3.

2. Охрана окружающей среды и рациональное использование природных ресурсов: статистический сборник. — Москва : Информцентр Госкомстата СССР, 1991. — 251 с.

3. В центральном Комитете КПБ и Совете Министров БССР : О мерах по улучшению экологической обстановки в республике // Советская Белоруссия. — 1989. — 28 марта. — С. 1.

4. Шимова, О. С. Основы экологии и экономика природопользования / О. С. Шимова, Н. К. Соколовский. — Минск : БГЭУ, 2002. — 367 с.